Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 39 (548) Аўторак, 31 снежня 1963 г. Цана 1 кап. Год выдання XVII-ы




# ДА НОВЫХ ПОСПЕХАЎ, ТАВАРЫШЫ!

★ А. Я. МАЛЫШАЎ, прарэктар па вучэбнай рабоце. ★

Увесь савецкі народ радуецца поспехам сваёй Радзімы, якая упэўнена і шпаркімі тэмпамі ідзе па шляху будаўніцтва камунізма, паслядоўна і цвёрда ажыццяўляе ленінскі курс суіснавання народаў.

Кожны крок на гэтым шляху азначае новыя перамогі савецкіх людзей ва ўсіх галінах эканамічнага і культурнага жыцця, паляпшае матэрыяльныя ўмовы жыцця народа, набліжае нас да запаветнай мэты — камунізма. Велізарнае значэнне для камуністычнага будаўніцтва маюць адобраныя ўсім народам рашэнні снежаньскага Пленума ЦК КПСС, накіраваныя на паспяховае ажыццяўленне Праграмы партыі.

Новым яркім выражэннем клопатаў партыі аб росквіту нашай Радзімы, аб дабрабыце народа з'яўляюцца зацверджаныя Вярхоўным Саветам СССР дзяржаўны бюджэт і дзяржаўны план развіцця народнай гаспадаркі краіны на 1964 год.

Удасканальваючы работу ў адпаведнасці з патрабаваннямі XXII з'езда КПСС, законаў аб умацаванні сувязі школы з жыццём і аб далейшым развіцці сістэмы народнай адукацыі, рашэнняў пленумаў ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па далейшаму развіццю вышэйшай і сярэдняй адукацыі, паляпшэнню падрыхтоўкі і выкарыстання спецыялістаў», калектыў універсітэта правёў значную работу па павышэнню якасці падрыхтоўкі маладых спецыялістаў.

У нашым універсітэце праroблена вялікая работа па удакладненню праграм, ліквідаванню дубліруючага вучэбнага матэрыялу і замене часткі лекцый рознымі відамі практычна- лабараторных заняткаў, паляпшэнню самастойнай работы студэнтаў.

Асаблівая ўвага была ўдзелена далейшаму павышэнню ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню лекцый, семінарскіх і практычных заняткаў. Студэнты паспяхова авалодваюць навыкамі вытворчай практыкі і стажорскай работы. Рыхтуючыся да навучальнага года, дэканаты факультэтаў, кафедры некалькі рацыяналізавалі вучэбны працэс і прывялі ў парадак загрузку студэнтаў абавязковымі заняткамі. Студэнты і выкладчыкі павінны добра ўяўляць сабе, што задача павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў можа быць выканана з дапамогай самастойнай работы студэнтаў. На сучасным этапе яна набывае асаблівае значэнне: адначасова з павышэннем патрабаванняў, якія прад'яўляюцца да будучых спецыялістаў, ускладняецца сістэма іх падрыхтоўкі. Вось чаму пытанні самастойнай работы студэнтаў неразрыўна звязана з методыкай вучэбнага працэсу.

Зімовая экзаменацыйная сесія павінна паказаць, як уплылі вынікі праведзеных мерапрыемстваў на арганізацыю і ўзровень самастойнай работы студэнтаў, дзе і што не зроблена і што неабходна зрабіць для лепшай падрыхтоўкі спецыялістаў.

У час мінулай зімовай сесіі было выяўлена шмат істотных недахопаў. Дастаткова сказаць, што з 3272 студэнтаў стацыянара, абавязаных здаваць экзамены, не з'явіліся па няўважлівых прычынах 104 чалавекі, а атрымалі нездавальняючыя адзнакі 358 чалавек. Асабліва трывожнае становішча было на фізічным факультэце, дзе не з'явіліся на экзамены 66 студэнтаў, а атрымалі «нездавальняюча» 95; на філалагічным факультэце, адпаведна, 37 і 49.

Большасць студэнтаў ліквідавала акадэмічную запазычанасць у час зімовых канікул. Аднак на некаторых факультэтах рад студэнтаў не выканаў гэтае патрабаванне і расцягнуў здачу экзаменаў на ўвесь другі семестр. Такое становішча нельга прызнаць нармальным ні пры якіх абставінах. Факультэты і кафедры маюць усё неабходнае для таго, каб правесці цяперашнюю сесію на належным узроўні, і, пры сур'ёзнай увазе да яе ўсіх выкладчыкаў і студэнтаў, калектыў універсітэта павінен дасягнуць высокіх паказчыкаў. Тым больш, што экзаменацыйная сесія будзе праходзіць у новым, 1964 годзе, годзе рашаючых перамог камуністычнага будаўніцтва і знамянуецца святкаваннем 45-годдзя Беларускай рэспублікі. Калектыў універсітэта абавязаны ў адказ на клопаты партыі і ўрада аб вышэйшай школе дасягнуць высокіх вынікаў у час экзаменацыйнай сесіі.

Ад імя рэктарата і партыйнага камітэта горача віншую прафесарска-выкладчыцкі састаў, студэнтаў і аспірантаў, увесь калектыў універсітэта з Новым годам, жадаю ўсім шчасця і добрага здароўя, новых вялікіх поспехаў у рабоце і вучобе.

# ЯНВАРЬ

*Наконец, явился долгожданный,*
*Постучал сосулькою в окно,*
*Как из ваты соткано стеклянной,*
*Снежное раскинул полотно.*

*Разукрасил во дворе деревья*
*Звездным инеем, как серебром.*
*Стал похож на древнее кочевье*
*Белой шапкою накрытый дом.*

*На стекле абстрактные узоры*
*Красотой своей пленяют всех,*
*Манят окна, как гипнотизёры,*
*Посмотреть на звёздно-синий снег*

*Волокнистою покрыв куделью*
*Сосны, белые стволы берёз,*
*Подпоясан белою метелью,*
*По дорогам бродит сам мороз.*

*Вячеслав ВЕРБИЛО,*
*студент I курса матфака.*

# КЛІЧУЦЬ ШЫРОКІЯ ДАЛІ

*«Ну вось, снежань прайшоў, цяпер час будзе працаваць на вясну, а там крапіва ды лябяда не дадуць памерці з голаду...» — некалі з такімі словамі сустракалі новы год мой дзед, бацька, тысячы беларускіх сялян. Праходзіў студзень, люты, а вясна не надыходзіла, а голад усе тужэй сцягваў ціскі, у якіх штогод аказваліся беднякі.*

*Як пра жудасны сон, успамінаем мы цяпер тыя часы. І гонарам напаўняецца сэрца за нашу партыю, за наш гераічны народ, калі параўноўваеш Беларусь савецкую з Беларуссю дарэвалюцыйнай. Непазнавальна змянілася яе абліччa, іншымі сталі і людзі яе. Цяпер, сустракаючы Новы год, яны радуюцца дасягнутым у камуністычным будаўніцтве поспехам, упэўнена глядзяць у будучыню, бо ведаюць, што новы год прынясе новыя радасці.*

*45-годдзе наша рэспубліка сустракае ў росквіту сваіх творчых сіл. Толькі за апошнія дзесяць гадоў валавая прадукцыя прамысловасці БССР узрасла больш як у тры разы, а прадукцыйнасць працы—у два. А вось яшчэ адна яркая лічба, якая прыводзілася на снежаньскім Пленуме ЦК КПСС: сярэднегадавы тэмп прыросту прамысловай прадукцыі ў Беларусі складае 12,4 працэнты.*

*Гавораць, лічбы сумная рэч. Але ў гэтых лічбах, лічбах росту сельскагаспадарчай вытворчасці, культуры, развіцця навукі Беларусі мы бачым усё ўзрастаючую творчасць народа. Лічбы нашага росту — гэта працоўны гімн вялікага гучання. У ім пафас стварэння і паэтычная прыўзнятасць, у ім цудоўны вобраз народа-волата.*

*Я зноў і зноў перачытваю рашэнні снежаньскага Пленума ЦК КПСС і кожны раз знаходжу для сябе новае. Дух захапляе, калі ўяўляеш, якую ролю адыграе ў бліжэйшыя гады хімія ва ўздыме народнай гаспадаркі, у росце матэрыяльнага дабрабыту. Камунізм —гэта Савецкая ўлада плюс электрыфікацыя краіны, плюс хімізацыя народнай гаспадаркі — у гэтых словах ярка выказаны задачы кожнага з нас.*

*Мы, аспіранты, часта сустракаемся, абмяркоўваем пытанні, якія хвалююць увесь народ. І вельмі часта ў гутарках даводзіцца чуць такую фразу: «У цудоўны час мы жывём!». Так, перад намі — шырокае поле для творчых даследаванняў, і наш абавязак — прысвяціць іх актуальным праблемам.*

Аспірант *В. ПІСАРАЎ.*

# КАЛІ ПОБАЧ СЯБРЫ...

Роза Васільчык — студэнтка нашага універсітэта. Але яна не здавала яшчэ ніводнай сесіі. Яна — камуніст, але на партуліку ў нас не стаіць. Нічога незвычайнага ў гэтым няма. Уся справа ў тым, што дзяўчына толькі сёлета паступіла ва універсітэт на завочнае аддзяленне юрыдычнага факультэта.

Мне давялося пазнаёміцца з Розай... у клініцы навукова-даследчага інстытута траўматалогіі і артапедыі, дзе я ляжаў пасля аперацыі. У адзін з вечароў, калі мы ўжо рыхтаваліся класціся спаць, з суседняй жаночай палаты пачуўся прыгожы дзявочы голас. Хтосьці спяваў настолькі добра і задушэўна, што ў першую хвіліну мы рашылі — перадаюць па радыё. Дзяўчына выканала некалькі украінскіх песень і скончыла свой невялічкі канцэрт арыяй Антаніды.

Уся наша. мужчынская палата аднадушна апладыравала выканаўцы. Гэтым мы выказвалі не толькі ўдзячнасць за задавальненне, але і аддавалі даніну павагі той, што, знаходзячыся ў аднолькавым з намі становішчы, здолела зрабіць добрае для ўсіх, яе вытрымцы. У далейшым такія канцэрты сталі паўтарацца часта. Мы прывыклі да іх.

Мне захацелася больш ведаць аб гэтай дзяўчыне. І неўзабаве мы пазнаёміліся. Вось яе гісторыя.

Розе 23 гады. Нарадзілася напярэдадні вайны. У чатырохмесячным узросце на яе звалілася няшчасце — яна захварэла поліяміэлітам. Некалькі гадоў дзяўчына была прыкавана да ложка. Урэшце рэшт хвароба адступіла, але вынікі яе давалі сябе адчуваць да нядаўняга часу.

Нярэдка перанесеныя траўмы прыводзяць да таго, што дзеці растуць замкнутыя, хваравіта ўспрымаюць адносіны да іх з боку акружаючых. З Розай гэтага не здарылася. Хутчэй за ўсё гэта вынік правільнага выхавання ў сям'і. Вялікую ролю ў жыцці дзяўчыны адыграла і школа. Вясёлая, прадпрыймальная, Роза заўсёды аказвалася ў гушчыні школьных спраў, ні ў чым не ўступала сваім аднагодкам.

Па яе словах, толькі аднойчы ёй прыйшлося патраціць шмат намаганняў, каб перамагчы нерашучасць. Гэта здарылася, калі сяброўкі пачалі запрашаць яе ў школьную самадзейнасць. І Роза не ўстаяла. Яна запісалася ў харавы гурток.

Гэтая падзея дазволіла дзяўчыне шырэй глянуць на жыццё. У яе быў добры голас, яе песні з задавальненнем слухалі не толькі ў школе, але і ў тых калгасах і на прадпрыемствах, дзе выступаў іх калектыў. Роза адкрыла для сябе, што яна можа прыносіць людзям радасць.

Гэта было вельмі важнае адкрыццё. У ім, відавочна, і хаваецца разгадка, чаму песня трывала ўвайшла ў яе жыццё.

Сярэднюю школу Роза скончыла са срэбным медалем, паступіла ў Мінскі тэхналагічны тэхнікум. А потым маладога спецыяліста накіравалі ў Ашмяны, на дражджавы завод.

Я не бываў у Ашмянах, не размаўляў з таварышамі Розы па рабоце, не глядзеў яе службовую характарыстыку. І усё ж многія дэталі запэўнілі мяне ў тым, што любоў да працы і імкненне быць карыснай грамадству выклікалі вялікую любоў і павагу да дзяўчыны. Аб гэтым гаворыць тое, што яе прынялі ў рады партыі. Што з райкома камсамола да Кастрычніцкага свята ёй у бальніцу прыслалі віншавальную тэлеграму. Што мясцовы камітэт без усялякіх з яе боку просьб прыслаў грашовы перавод, каб Роза у час лячэння не мела матэрыяльных цяжкасцей. Нарэшце, я бачыў, як ледзь не кожны дзень ёй у палату прыносілі пісьмы ад таварышаў па рабоце, ад удзельнікаў мастацкай самадзейнасці раёна.

Значыць, добрае насенне пасеяла Роза Васільчык, калі яны даюць такія ўсходы!

Роза перанесла тры складаныя аперацыі. Урачы сцвярджаюць, што апошняя найбольш удалая і вынікі хваробы будуць амаль непрыкметнымі.

Але Роза думае не толькі пра выздараўленне. На падаконніку ляжаць кнігі. Дзяўчына рыхтуецца да сваёй першай сесіі ва універсітэце. Яна марыць яшчэ аб тым, каб перавесціся на стацыянар, каб выступаць на універсітэцкай сцэне. Як-ніяк, на конкурсе маладых выканаўцаў Гродзенскай вобласці ў 1961 годзе яна была ўзнагароджана дыпломам I ступені

Ад усёй душы жадаю Розе поспехаў ва ўсіх яе справах і пачынаннях. Я упэўнены, што ва універсітэце ў яе будзе таксама шмат сяброў. «Калі хочаш жыць для сябе, жыві для іншых», — гэтыя словы належаць рымляніну Сенеку. Роза Васільчык будуе жыццё па гэтаму прынцыпу. І гэта самая каштоўная асаблівасць яе характару.

Хочацца сказаць і пра іншае. У бальніцы Роза не адчувае сябе адзінокай. Да яе добра адносяцца медыцынскія работнікі, хворыя, не забываюць таварышы. І толькі з юрыдычнага факультэта ніхто не пабываў у дзяўчыны. Гэта не папрок. Адкуль маглі ведаць на факультэце, што адна з іх завочніц ляжыць у бальніцы? Але, думаецца, што гэтае упушчэнне будзе ліквідавана. Дзяўчыне патрэбна падтрымка і таварыская дапамога ў падрыхтоўцы да экзаменаў. Няхай у дружную сям'ю юрыстаў увойдзе яшчэ адзін чалавек.

Варлен БАРКАН.

